Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Гомель: У выбаркаме запар чыноўнікі, замаскіраваныя пад грамадскасць

22.05.2020 **Тэгі**: выбары-2020




Скрыншот з сайта Савецкага раёна г. Гомеля

Афіцыйны сайт адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля апублікаваў звесткі аб персанальным складзе раённай камісіі па прэзідэнцкіх выбарах. Доўгатэрміновы назіральнік Леанід Судаленка прааналізаваў склад камісіі ў параўнанні з мінулымі выбарамі прэзідэнта ў 2015 годзе, паведамляе "Гомельская Вясна".

Па словах назіральніка, з 13 членаў раённага выбаркама толькі тры чалавека не ўваходзілі ў папярэдні склад раённай камісіі.

Старшыня камісіі **Андрэй Сергіенка** працуе гендырэктарам Гомельаблгаза. На мінулых выбарах з'яўляўся намеснікам старшыні камісіі. Як і ў мінулы раз - вылучаўся ад грамадзянаў. Яго намеснік, намесніца кіраўніка райадміністрацыі **Алена Герашчанка** на мінулых выбарах з'яўлялася старшынёй камісіі, вылучалася ад Беларускага саюза жанчын. Сакратар камісіі **Ала Андрушчанка,** як і мінулы раз, вылучалася ад грамадзян, працуе начальнікам арганізацыйна-кадравага аддзела адміністрацыі раёна.

У склад раённага выбаркама, як і на мінулых выбарах, ад грамадзянаў увайшла супрацоўніца адміністрацыі **Валянціна Баева**. Дырэктар раённага архітэктурнага бюро **Сяргей Куцапаленка** вылучаны ад БРСМ, хоць на мінулых выбарах вылучаўся аб грамадзянаў. Галоўбух адміністрацыі

**Наталля Сачыловіч** зараз вылучаная ад Чырвонага Крыжа, на мінулых выбарах таксама вылучалася ад грамадзянаў.

Старшыня асацыяцыі ветэранаў **Аляфціна Свірыдава** спосаб свайго вылучэння ў камісію не мяняе, як зрэшты і і яе калега з прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі **Наталля Шапарава**.

Прадстаўнікамі праўрадавых палітычных партый у камісію, як і на папярэдніх выбарах, патрапілі **Ларыса Вайтовіч** з Камуністычнай партыі і **Лідзія Свердлікава** з Партыі працы і справядлівасці. Яшчэ адзін прадстаўнік ад Сацыял-дэмакратычнай партыі Народнай Згоды **Сяргей Марцюхін** у камісіі навічок.

Два іншыя новенькія, якія будуць лічыць галасы выбаршчыкаў, у склад раённага выбаркама вылучаныя ад грамадскіх аб'яднанняў: **Уладзімір Курганскі** - ад Саюза афіцэраў і **Юрый Сачыўка** - ад Белай Русі. Аб месцы іх працы не паведамляецца.

Назіральнік кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" Леанід Судаленка дадаў, што ў маючай адбыцца палітычнай кампаніі інцыятыўныя групы па зборы подпісаў выбаршчыкаў зарэгістравалі 15 прэтэндэнтаў у кандыдаты, уключаючы дзеючага кіраўніка рэспублікі. Але правяраць і лічыць галасы выбаршчыкаў у адным з раёнаў Гомеля будзе камісія, якая складаецца выключна з прадстаўнікоў толькі аднаго з кандыдатаў.

*"Праваабаронцы за свабодныя выбары"*

Твитнуть








"Беларусі пахваліцца няма чым". У Вене прайшла кансультацыя пра мірныя пратэсты

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

WWW.GAZETABY.CO

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?

У палітвязня ў турме здарыўся інфаркт і інсульт. Яго адправілі ў калонію

"А ў чым мне прызнаваць віну?" Гісторыя палітвязня з чырвонай біркай

Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык



ГАЛОЎНАЕ










## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Я не асуджаная, я ў палоне". Маналог Алены Лысковіч — былой палітзняволенай пасля "хіміі"

Жанчыну асудзілі на 1,5 года калоніі за ўдзел у Маршах

"Гэта атрад АМАП "пережестил": як у Бабруйску пераследавалі мужчыну з інваліднасцю

Палітзняволеную Яну Пінчук, якую экстрадавалі з Расіі, асудзілі да 12 гадоў калоніі

У Варшаве адбылася прэзентацыя інсталяцыі "1525", прысвечанай беларускім палітвязням (фота)

Шэсць гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму прысудзілі айцішніку з Брэста

Праграміста Аляксандра Лагуту асудзілі да двух з паловай гадоў "хіміі" за "паклёп" на Лукашэнку

Ціск на палітвязняў, папаўненне ў "спісе экстрэмістаў": хроніка пераследу 3-5 чэрвеня

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023

За распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў і абразу Лукашэнку асудзілі жыхара Ліды

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

# Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023










## ПАРТНЁРСТВА

## СЯБРОЎСТВА





































E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY